ФОРМУЛЯР КНИГИ
УК-4553

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка»

***І.І. Багдановіч***

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ Ў ШКОЛЕ

Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь
у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў вышэйшых
навучальных установаў па спецыяльнасцях «Гісторыя»,
«Гісторыя. Замежная мова», «Гісторыя. Рэлігіязнаўства»,
«Гісторыя. Сацыяльна-палітычныя дысцыпліны»

Мінск 2009

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № УК 4553

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 930(075.8)
ББК 63.3я73
Б142

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Рэцэнзенты:
кафедра ўсходнеславянскай і расійскай гісторыі (загадчык кафедры – кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.А. Вараб'ёў*) і кафедра педагогікі (загадчык кафедры – кандыдат педагагічных навук, дацэнт *А.І. Снапкова*) Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова;
кандыдат педагагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры кіравання Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі *М.А. Краснова*

**Багдановіч, І.І.**
Б142 Методыка выкладання гісторыі ў школе : вучэб. дапам. / І.І. Багдановіч. – Мінск : БДПУ, 2009. – 286 с.
ISBN 978-985-501-811-8.

У дапаможніку раскрываецца змест курса методыкі выкладання гісторыі, вызначаюцца кірункі навучання гісторыі ў сучаснай школе. Паслядоўна выкладзены і сістэматызаваны матэрыял выдання ўтрымлівае неабходныя звесткі для засваення новага і замацавання вывучанага на занятках па методыцы гісторыі. Актуалізуюцца праблемы рэалізацыі адукацыйна-выхаваўчых задач у працэсе выкладання гісторыі. Дапаможнік распрацаваны ў адпаведнасці з Дзяржаўным стандартам па спецыяльнасці «Гісторыя», зацверджаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Прызначаецца студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, выкладчыкам ВНУ і каледжаў, настаўнікам школ і гімназій і ўсім, хто цікавіцца методыкай выкладання гісторыі.

**УДК 930(075.8)**
**ББК 63.3я73**

© Багдановіч І.І., 2009
© БДПУ, 2009

**ISBN 978-985-501-811-8**

# УВОДЗІНЫ

Паспяховае вырашэнне задач навучання гісторыі ў многім залежыць ад настаўніка, яго прафесійнага майстэрства, эрудыцыі і культуры. Методыка выкладання гісторыі займае вядучае месца ў падрыхтоўцы настаўніка гісторыі. Яна заклікана даць будучым выкладчыкам тэарэтычныя асновы сучаснай методыкі выкладання, выпрацаваць першапачатковыя ўменні і навыкі, неабходныя для арганізацыі эфектыўнага навучання, падрыхтаваць студэнтаў да рэалізацыі выхаваўчых і развіццёвых магчымасцей, закладзеных у школьных курсах айчыннай і сусветнай гісторыі. Авалоданне асновамі тэорыі і методыкі паскорыць прафесійнае станаўленне маладога настаўніка. Дадзены вучэбны дапаможнік ставіць сваёй мэтай дапамагчы студэнтам і настаўнікам гісторыі, якія пачынаюць сваю педагагічную дзейнасць, авалодаць асноўнымі заканамернасцямі працэсу навучання гісторыі, што закладзены ў аснове станаўлення прафесійнага майстэрства.

Першыя чатыры тэмы дапаможніка прысвечаны характарыстыцы методыкі выкладання гісторыі як навукі, асноўных этапаў яе развіцця – ад станаўлення гістарычнай адукацыі ва ўсходнеславянскіх землях і да нашых дзён. Значнае месца ў гэтых главах надаецца аналізу і характарыстыцы вопыту выкладання дадзенай дысцыпліны ў дарэвалюцыйны і ў савецкія часы, метадам і формам арганізацыі навучання гісторыі, якія напрацаваны ў методыцы за стагоддзі, сталі класічнымі і паспяхова выкарыстоўваюцца ў нашы дні. У дапаможніку ўпершыню распрацавана і прадстаўлена ў якасці самастойнай праблема станаўлення і развіцця нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Наступныя главы дапаможніка паслядоўна раскрываюць асноўныя кампаненты працэсу навучання гісторыі: мэты і задачы навучання гісторыі ў школе, яе змест, працэс фарміравання гіста-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ